


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 5 (160) 19 ЛЮТАГА 1991 ГОДА


## ДА ЎВАГІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СТУДЭНТАЎ

У сярэдзіне сакавіка гэтага года плануецца правесці вытворчую нараду з парадкам дня «Аб рабоце адміністрацыі і прафкомаў Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я. Купалы па стварэнню ўмоў для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і сацыяльнай абароненасці выкладчыкаў і студэнтаў пры пераходзе да рынку».

Просім свае прапановы, заўвагі і пытанні, звязаныя з карэнным паляпшэннем якасці падрыхтоўкі і выкарыстання маладых спецыялістаў у народнай гаспадарцы і сацыяльнай абароненасці супрацоўнікаў накіроўваць у пісьмовай форме ў навучальны аддзел і прафком універсітэта, якія будуць выкарыстаны для падрыхтоўкі нарады.

## «Акадэмсервіс» прапануе

Паважаныя студэнты, сёння вы маеце магчымасць атрымаць інфармацыю аб умовах паступлення ў амерыканскія універсітэты і чатырохгадовыя каледжы.

НВА «Акадэмсервіс» з'яўляецца першым незалежным інфармацыйным цэнтрам Расіі для аказання паслуг савецкім студэнтам, якія жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю ў Злучаных Штатах Амерыкі. Зараз зацікаўленасць да гэтага вельмі высокая, аднак, высокія і патрабаванні пры паступленні ў амерыканскія вышэйшыя навучальныя установы.

«Акадэмсервіс» можа прадставіць пералік усіх неабходных дакументаў, уключаючы форму звароту, умовы паступлення ў тым ліку:

— адрас (не больш трох) універсітэта або каледжа па любой з выбранай вамі спецыяльнасці;

— катэгорыю навучальнай установы і тэрмін навучання ў ёй;

— умовы правядзення ўступных гутарак, тэстаў і экзаменаў;

— умовы і тэрміны здачы экзамену па англійскай мове;

— аплата за навучанне.

Па запыту Бланк інфармацыйнай анкеты для правядзення пошуку «Акадэмсервіс» высылае бясплатна ўсім жадаючым. Для гэтага неабходна даслаць у наш адрас канверт з адрасам адпраўшчыка.

Кошт інфармацыйнага і наш разліковы рахунак мы высылаем асобам, якія прыслалі запыт.

Якасць і аб'ём пошуку гарантуюцца. Просьбы па ўдакладненню той ці іншай інфармацыі мы будзем імкнуцца выканаць.

Нашы тэлефоны: 272-74-34, 335-19-71.

117485, Масква, Абанентная скрынка № 49.

**Афіцыйны раздзел**

# ПАЛАЖЭННЕ

## аб Выканаўчым Камітэце студэнцкага форума БССР

І. Агульныя палажэнні

1. Выканком РСФ з'яўляецца выканаўчым органам студэнцкага форума, які дзейнічае па выкананню яго рашэнняў у перыяд паміж скліканнямі форумаў.

2. Выканком РСФ ствараецца па рашэнню форума з ліку яго дэлегатаў і прадстаўнікоў арганізацый-заснавальнікаў у парадку, вызначаным непасрэдна РСФ.

3. Асноўнымі задачамі выканкома з'яўляюцца:

— рэалізацыя рашэнняў РСФ;

— выражэнне і адстайванне інтарэсаў студэнцтва рэспублікі;

— падрыхтоўка склікання ўстаноўчай канферэнцыі студэнцкай арганізацыі;

— забеспячэнне ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў рэспублікі інфармацыяй па пытаннях, якія датычацца інтарэсаў студэнцтва;

— абагульненне вопыту арганізацыйнага афармлення студэнцкага руху і каардынацыя дзейнасці студэнцкіх аб'яднанняў;

— падрыхтоўка і скліканне наступнага студэнцкага форума.

4. Выканком РСФ здзяйсняе сваю дзейнасць пры арганізацыйнай падтрымцы і за кошт фінансавання арганізацый-заснавальнікаў РСФ: ЦК ЛКСМБ, Федэрацыі прафсаюзаў і Міністэрства народнай адукацыі БССР, іншых крыніц згодна з заканадаўствам БССР.

ІІ. Структура, кіраванне і кампетэнцыя:

1. Выканком выступае ад імя студэнцкага форума па тых пытаннях, якія не супярэчаць рашэнням РСФ. Выканком РСФ згодна з рашэннямі форума можа ствараць часовыя і пастаянныя камісіі, прыцягваць спецыялістаў у якасці кансультантаў пры рэалізацыі рашэнняў форума.

2. Дзейнасцю выканкома кіруюць старшыня і намеснік старшыні, якіх выбірае непасрэдна РСФ.

3. Старшыня ВК РСФ:

— кіруе ўсёй дзейнасцю ВК РСФ, размяркоўвае абавязкі паміж яго членамі, робіць справаздачу перад РСФ аб выніках работы выканкома.

У выпадку датэрміноватага выбыцця старшыні па аб'ектыўных прычынах аго абавязкі да склікання форума выконвае намеснік старшыні.

4. Асноўнай формай здзяйснення паўнамоцтваў ВК РСФ з'яўляецца агульны сход членаў ВК, які:

— распрацоўвае планы і праграмы дзейнасці згодна з рашэннямі РСФ;

— дае даручэнні членам ВК РСФ па рэалізацыі рашэнняў форума.

5. Агульны сход ВК РСФ склікаецца старшынёй па неабходнасці, але не радзей 1 разу ў 6 месяцаў.

6. Агульны сход правамоцны пры наяўнасці больш 1/2 членаў ВК. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў.

7. Выканком РСФ мае права ад імя форума звяртацца ў органы дзяржаўнага ўпраўлення, арганізацыі і ўстановы рэспублікі для прыняцця адпаведных рашэнняў у інтарэсах студэнцтва Беларусі.

8. Прадстаўніцтва навучальных устаноў абласцей і арганізацый-заснавальнікаў у ВК РСФ здзяйсняецца ў наступным колькасным саставе:

Брэсцкая вобласць — 2 чалавекі
Віцебская вобласць — 2
Гомельская вобласць — 2
Гродзенская вобласць — 2
Мінская вобласць — 1
г. Мінск — 3
Магілёўская вобласць — 2
ЦК ЛКСМБ — 1
ФПС БССР — 1
МНА БССР — 1

9. Штаб-кватэра выканкома РСФ знаходзіцца ў г. Мінску.

Члены ВК РСФ ад Гродзенскай вобласці:

1. Філіпчык Валерый Вячаслававіч — студэнт гістфака дзяржуніверсітэта г. Гродна (г. Гродна, вул. Сацыялістычная, 66-14, раб. тэл. 44-80-96).

2. Шышкоўская Алена Леанідаўна — студэнтка індустрыяльнага тэхнікума г. Ліды (г. Ліда, вул. Ламаносава, 12-53, дам. тэл. 2-06-32).

## Аб заключэнні індывідуальных дагавораў

**Паважаныя студэнты, слухачы падрыхтоўчых аддзяленняў, навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, праявіўшы ініцыятыву, заключыўшы дагавор з прадпрыемствам, вы можаце забяспечыць сабе гарантыю працаўладкавання пасля сканчэння універсітэта, тэхнікума, атрымаеце прадугледжаныя дагаворам і льготы, значэнне якіх узрастае ў сувязі з пераходам да рынычных адносін. Сёння мы знаёмім вас з палажэннем «Аб парадку і ўмовах заключэння індывідуальных дагавораў прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі са студэнтамі, слухачамі падрыхтоўчых аддзяленняў вышэйшых і навучэнцамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў», прынятым на аснове загаду Дзяржаўнага камітэта СССР па народнай адукацыі ад 5 ліпеня 1990 года № 466 «Аб парадку заключэння індывідуальных дагавораў пры падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй».**

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ ПАРАДКУ І ЎМОВАХ ЗАКЛЮЧЭННЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ДАГАВОРАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ, АРГАНІЗАЦЫЯМІ, УСТАНОВАМІ СА СТУДЭНТАМІ, СЛУХАЧАМІ ПАДРЫХТОЎЧЫХ АДДЗЯЛЕННЯЎ ВЫШЭЙШЫХ І НАВУЧЭНЦАМІ СЯРЭДНІХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

1. Кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў або іх намеснікі (далей названыя «прадпрыемства») па ўзгадненню з Саветам (праўленнем) прадпрыемства (саветам працоўнага калектыву) і прафсаюзным камітэтам, са згоды рэктара (дырэктара) навучальнай установы і яго намесніка (далей названыя «навучальная ўстанова») заключаюць індывідуальныя дагаворы са студэнтамі, слухачамі падрыхтоўчых аддзяленняў вышэйшых і навучэнцамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пасля іх залічэння на дзённыя аддзяленні (падрыхтоўчыя аддзяленні) навучальных устаноў або ў працэсе навучання.

Пры заключэнні індывідуальнага дагавору навучальная ўстанова выступае гарантам выканання ўмоў дагавору.

Першачарговым правам заключэння індывідуальных дагавораў са студэнтамі, навучэнцамі і слухачамі падрыхтоўчых аддзяленняў карыстаюцца прадпрыемствы, якія маюць дагаворы з навучальнай установай аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў.

2. Індывідуальны дагавор складаецца па формах, узоры якіх можна ўзяць у навучальным аддзеле.

Дагаворы афармляюцца ў трох экзэмплярах і падпісваюцца студэнтам, навучэнцам, слухачом і галоўным бухгалтарам прадпрыемства і навучальнай установы і замацоўваюцца пячацямі прадпрыемства і навучальнай установы.

Правы і абавязкі прадпрыемства, студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, слухачоў падрыхтоўчых аддзяленняў пры ВНУ вызначаюцца дзейнічаючым заканадаўствам і ўмовамі індывідуальнага дагавору.

3. Дзяржаўныя прадпрыемствы, арганізацыі, установы, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, выплачваюць за кошт сваіх сродкаў паспяваючым студэнтам вышэйшых і навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў пры ВНУ стыпендыю на 30 працэнтаў вышэйшую, пры стажы работы больш чым тры гады на 50 працэнтаў вышэйшую за дзяржаўную стыпендыю, устаноўленую для адпаведных спецыяльнасцей, курса, навучальнай установы.

Прадпрыемствы згодна з дзейнічаючым заканадаўствам могуць аказаць студэнтам і навучэнцам, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, матэрыяльную дапамогу і паслугі (санаторна-курортнае абслугоўванне, а таксама браць абавязацельствы па пагашэнню грашовых крэдытаў, прадстаўленых студэнту (навучэнцу) Ашчадбанкам СССР.

4. Студэнты і навучэнцы, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, праходзяць згодна з устаноўленымі патрабаваннямі вытворчую і пераддыпломную практыку на гэтых прадпрыемствах або, па ўзгадненню паміж прадпрыемствамі, на перадавых прадпрыемствах роднаснага профілю.

5. Навучальныя ўстановы з улікам рэкамендацый прадпрыемства могуць уключаць у навучальныя планы дадатковыя дысцыпліны.

Тэмы дыпломных праектаў (работ) студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў, якія заключылі дагаворы, зацвярджаюцца пасля ўзгаднення з прадпрыемствамі.

Студэнты, навучэнцы, якія заключылі індывідуальныя дагаворы, абавязаны пасля заканчэння навучальнай установы прапрацаваць на прадпрыемствах тэрмін, прадугледжаны ў дагаворы, але не менш трох гадоў.

6. У індывідуальных дагаворах павінны быць прадугледжаны ўмовы іх скасавання, ільготы згодна з дзейнічаючым заканадаўствам, а таксама парадак вырашэння спрэчак, звязаных з выкананнем дагавору.

Скасаванне індывідуальнага дагавору па ініцыятыве студэнта, навучэнца, слухача, выпускніка дапускаецца ў выпадках:

— устанаўлення аднаму з бацькоў або мужу (жонцы) студэнта, навучэнца, слухача, выпускніка інваліднасці першай або другой групы;

— калі выпускнік — цяжарная жанчына, маці або бацька, якія маюць дзіця ва ўзросце да трох гадоў;

— невыкананне прадпрыемствам умоў дагавору.

7. Скасаванне індывідуальнага дагавору па ініцыятыве прадпрыемства дапускаецца ў выпадку нізкай якасці паспяховасці студэнта, навучэнца, слухача.

8. Індывідуальны дагавор скасоўваецца пры:

**(Працяг на стар. 2).**

# ПЕДАГОГІКА НА ШЛЯХУ ПЕРАБУДОВЫ

На сваім снежаньскім пасяджэнні супрацоўнікі кафедры педагогікі зацвердзілі новую тэматыку курса «Педагогіка» па праграме для дзяржуніверсітэтаў. Да гэтага рашэння прывяло некалькі акалічнасцей. Па-першае, крызіс грамадскіх навук балюча адбіўся на змесце педагогікі. Доўгі час педагогіка выконвала сацыяльны заказ, па якому трэба было абгрунтаваць і даказаць магчымасць усебаковага развіцця абавязкова кожнага дзіцяці і нават дарослага чалавека. Амаль не было чаго сказаць студэнтам пра дыферэнцыяцыю навучання і выхавання і пра многія іншыя праблемы. Па-другое, педагогіка была адной са звышпалітызаваных навук, якая павінна была перакласці на тэорыю і метадыку выхавання загадзя прадстаўленыя зверху напрамкі і кірункі, напрыклад, рэалізаваць комплексны падыход у выхаванні. Такая казуістыка прывяла да канвеера ў выхаванні. Вучоныя падлічылі, што за гады вучобы ў школе хлопчык ці дзяўчынка павінны былі ўдзельнічаць у прыкладна 250 выхаваўчых мерапрыемствах, якія паўтараліся з нязначнымі зменамі з году ў год. Так, у лютым праводзіўся месячнік абароннамасавай работы (бараніцца заўсёды было ад каго), першага верасня — Дзень ведаў, другога кастрычніка — лінейка ўсёй школы, прысвечаная выступленню У. І. Леніна на III з ́ездзе ЛКСМ і г. д. Па-трэцяе, за гэтыя гады адбылося шмат перамен у арганізацыі народнай асветы, ідуць працэсы адраджэння нацыянальнай школы. Дзякуючы актыўнай пазіцыі Міністэрства народнай адукацыі БССР і яго міністра М. І. Дзямчука, Беларусь стварае сучасную сістэму навучання і выхавання, адпавядаючую агульнапрынятым у свеце стандартам.



Сваю ролю адыгралі таксама заўвагі і прапановы студэнтаў нашага універсітэта, вывучэнне вопыту выкладання педагогікі ў іншых навучальных установах і ў нашых суседзяў у Польшчы.

У чым заключаюцца асноўныя напрамкі перабудовы курса «Педагогіка»? Адным з напрамкаў з ́яўляецца забеспячэнне прыкладна аднолькавага ўзроўню ведаў у падрыхтоўцы студэнтаў розных факультэтаў па гэтай дысцыпліне. Педагогіка зараз разглядаецца не толькі як практычная навука, тэхналогія паводзін настаўніка ў розных абставінах, а як фундаментальная гуманітарная дысцыпліна, якая моцна ўплывае на агульнакультурнае развіццё выпускніка. Фундаментальнасць, высокі навуковы ўзровень, улік спецыфікі факультэта, будова зместу на агульначалавечых каштоўнасцях — вось толькі некаторыя рысы абноўленага курса.

Але парайце, калі ласка, паважаныя чытачы газеты, як дабіцца аднолькавай падрыхтоўкі, калі на факультэтах фізічнай культуры, гісторыі і спецыяльнасці «Матэматыка і фізіка» вучэбнымі планамі адведзена на педагогіку і методыку выхаваўчай работы 150—166 вучэбных гадзін, а на філалагічным факультэце (на ўсіх спецыялізацыях) — 80!? Дарэчы, год за годам знікаюць залікі і іншыя віды кантрольных работ. Не заўсёды хапае часу ў вучэбных планах нават на тыя факультатывы па педагогіцы, па якіх членамі кафедры выдадзены кнігі. Так, вопыт даследаванняў і выкладання лёг у аснову выдадзеных кніг «Настаўнік-стажор — у школе» (дац І. А. Карпюк), «Вартасныя якасці падлеткаў» (дац. І. І.练коп ́еў), «Тварам да моладзі» (дац. В. П. Таранцей). Але, калі І. А. Карпюк і В. П. Таранцей яшчэ маюць магчымасць данесці гэтыя веды на адным з факультэтаў, то факультатыў І. І. Пракоп ́ева, на які студэнты ішлі заўсёды з ахвотай, напрыклад, на філфаку, знік па невядомых нам прычынах зусім.

Абвешчаная самастойнасць і незалежнасць навучальных устаноў і факультэтаў (ад каго ці чаго? Вядома, не ад якасці падрыхтоўкі спецыялістаў) прывяла да відавочных хібаў у арганізацыі педагагічнай практыкі. Адыграла сваю ролю таксама і суперагітацыя супраць педагагічных спецыяльнасцей у мінулыя гады (1978—1985) пад сцягам стварэння інжынерных патокаў і факультэтаў. Час ад часу кафедры прыходзіцца раптоўна рыхтаваць педагогаў з тых студэнтаў, будучых інжынераў, ад якіх яшчэ ў гады навучання адмовіліся заказчыкі.

На наш погляд, трэба было б у разумных мерах прывесці ў адпаведныя рамкі колькасць гадзін, якія з улікам самастойнай і індывідуальнай работы павінны саставіць прыкладна 120 гадзін (у тым ліку 90 гадзін аудыторных). Аудыторныя гадзіны могуць быць размеркаваны наступным чынам: 42 гадзіны лекцый, 18 гадзін семінараў, 30 гадзін лабараторных заняткаў. У апошні час мы мелі лабараторныя заняткі толькі на факультэце фізічнай культуры.

Заўважым, што нідзе не знойдзеце ў свеце, акрамя СССР, каб будучы настаўнік не быў азнаёмлены з гісторыяй станаўлення адукацыі і выхавання. Відаць, трэба было б разгледзець на саветах факультэтаў пытанне аб увядзенні ў змест навучання гэтай дысцыпліны на ўсіх спецыяльнасцях. Трэба было б, каб лагічны ланцужок вывучэння педагагічных дысцыплін быў наступным: 1 курс, 2 семестр — гісторыя педагогікі, II курс, 3—4 семестры — педагогіка, III курс, 5—6 семестры — курсы «Методыка выхаваўчай работы», «Педагагічнае майстэрства», частка спецкурсаў або спецсемінараў і спецпрактыкумаў, IV курс, 7—8 семестры — факультатывы па выбару.

Мяркуецца, што абноўлены курс педагогікі ўключыць у сябе раней не вывучаемыя студэнтамі тэмы: «Бесперапынная адукацыя ў СССР: вопыт і праблемы. Характарыстыка школы БССР», «Спадчыннасць чалавека і праблемы выхавання і адукацыі», «Педагогіка падлеткавага ўзросту», «Сістэма паслявузаўскага навучання педагога. Малады настаўнік у выхаваўчай сістэме школы» і інш. На семінарскіх занятках мяркуецца грунтоўна прааналізаваць пытанні дыдактыкі (урок, метады, прыёмы і сродкі навучання і інш.), выхавання дзяцей з улікам розных сацыяпедагагічных фактараў, школазнаўства. Лабараторныя заняткі прысвечаны вывучэнню метадаў навукова-педагагічных даследаванняў, у тым ліку сучасных методык вызначэння вучэбных магчымасцей і ўзроўню выхавання вучняў, методыкі планавання ўрокаў розных тыпаў, арганізацыі самавыхавання.

Члены кафедры на занятках глыбока вывучаць шляхі, метады і прыёмы ўзаемадзеяння педагога з нефармальнымі аб ́яднаннямі і іншымі групамі моладзі.

Лекцыі, семінары, лабараторныя заняткі пасля распрацоўкі іх выкладчыкамі будуць абмяркоўвацца на пасяджэннях кафедры, рэцэнзавацца на кафедрах іншых навучальных устаноў. Мяркуецца, што ў змесце паловы лекцый адлюструюцца вынікі даследаванняў вучоных нашай кафедры. Толькі за апошнія пяць гадоў выкладчыкі кафедры выпусцілі ў свет тры кнігі, яшчэ тры манаграфіі агульным аб ́ёмам больш,чым 60 друкаваных аркушаў знаходзяцца ў вытворчасці, надрукавалі звыш 100 артыкулаў і тэзісаў, правялі адну ўсесаюзную і адну рэспубліканскую навукова-практычныя канферэнцыі.

Педагогі разлічваюць на падтрымку рэктара, Савета універсітэта, саветаў факультэтаў, дэканатаў, студэнтаў, усіх зацікаўленых асоб. З праграмай абноўленага курса «Педагогіка» ўсе жадаючыя могуць пазнаёміцца на кафедры або ў кабінеце педагогікі (ауд. 213, 223). Члены кафедры будуць удзячны за канструктыўную крытыку і слушныя прапановы.

**В. ТАРАНЦЕЙ,**
**загадчык кафедры педагогікі.**



(Працяг. Пачатак на стар. 1).

— немагчымасці работы выпускніка па спецыяльнасці на прадпрыемстве згодна з заключэннем ВТЭК або ВКК;

— адлічэнне з навучальнай установы студэнта (навучэнца, слухача).

9. Калі выпускнік, які мае дагавор з прадпрыемствам, не абараніў дыпломны праект (работу) або не здаў дзяржаўныя экзамены, прадпрыемства мае права скасаваць дагавор або прыняць на работу з улікам спецыяльнасці, па якой ён навучаўся ў навучальнай установе.

10. Выпускнік, які заключыў дагавор і прызваны ў рады Узброеных Сіл СССР, пасля заканчэння тэрміну службы абавязаны з'явіцца на работу на прадпрыемства, з якім у яго быў заключаны дагавор.

Тэрмін службы ва Узброеных Сілах СССР залічваецца ў тэрмін прадугледжанай дагаворам абавязковай работы выпускніка на прадпрыемстве.

11. Час знаходжання жанчыны ў водпуску па цяжарнасці, родах і па дагляду за дзецьмі залічваецца ў тэрмін абавязковай работы на прадпрыемстве па дагавору.

12. Калі муж або жонка, якія заканчваюць навучальную ўстанову, заключылі дагавор з прадпрыемствам, то незалежна ад таго,хто з іх заканчвае навучальную ўстанову раней, другому (мужу ці жонцы) работа даецца на прадпрыемствах,размешчаных у тым жа горадзе (раёне), дзе знаходзіцца прадпрыемства, якое заключыла дагавор са студэнтам (навучэнцам), або даецца права ва ўстаноўленым парадку самастойнага працаўладкавання.

Калі муж і жонка, якія заканчваюць навучальныя ўстановы, заключылі індывідуальныя дагаворы з прадпрыемствамі, размешчанымі ў розных гарадах, то месца іх работы вызначаецца па дагаворанасці паміж імі і прадпрыемствамі, а ў выпадку разнагалосся адзін з іх мае права скасаваць дагавор.

13. Калі выпускнік не з'явіўся на прадпрыемства або адказваецца прыступіць да работы згодна з заключаным дагаворам без уважлівых прычын, калі яго звальняюць да сканчэння ўстаноўленага тэрміну работы за парушэнне працоўнай дысцыпліны ці за іншыя праступкі, за якія заканадаўствам прадугледжана звальненне з работы, ён абавязаны вярнуць прадпрыемству грошы, затрачаныя на выплату стыпендыі, і сродкі, выплачаныя яму ў сувязі з пераездам на работу ў іншую мясцовасць.

У тым выпадку, калі выпускнік з ́явіўся на работу пазней тэрміну, указанага ў дагаворы, без уважлівых прычын прадпрыемства можа змяніць умовы, прадугледжаныя ў дагаворы (месца работы, пасаду, памер заработнай платы), і даць пасаду з улікам атрыманай ім у навучальнай установе спецыяльнасці. Іншыя льготы, прадугледжаныя Палажэннем аб размеркаванні і выкарыстанні ў народнай гаспадарцы выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, для выпускніка захоўваюцца.

15. Прадпрыемства, якое не забяспечыла выпускніка работай на ўмовах, прадугледжаных індывідуальным дагаворам, абавязаны ў двухмесячны тэрмін працаўладкаваць выпускніка на іншую работу па спецыяльнасці, набытай ім у навучальнай установе або, па жаданню выпускніка, даць яму права ва ўстаноўленым парадку самастойнага працаўладкавання. У гэтым выпадку, а таксама пры датэрміновым скасаванні дагавору па ініцыятыве прадпрыемства выпускнік вызваляецца ад выплаты стыпендыі і іншых відаў грашовай кампенсацыі. Прадпрыемства выплачвае выпускніку зарплату (прадугледжаную ў дагаворы) за час, пакуль ён не ўладкуецца на іншую работу, але не больш, чым за два месяцы.

Спрэчкі, звязаныя з работай выпускніка згодна з заключаным дагаворам, вырашаюцца ў парадку, прадугледжаным дзейнічаючым заканадаўствам.

# ДА 150-ГОДДЗЯ ГІСТОРЫКА В. О.КЛЮЧЭЎСКАГА



**Працягваем публікацыю матэрыялаў, падрыхтаваных студэнтамі гістарычнага факультэта, прысвечаных 150-годдзю В. О. Ключэўскага.**

## РЫЦАР ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

«Жыццёвыя няроўнасці і выпадковасці прывучылі яго (т. е. чалавека) больш абмяркоўваць пройдзены шлях, чым узважваць далейшы, больш аглядвацца назад, чым заглядваць наперад». Гэта выказванне выдатнага рускага гісторыка В. О. Ключэўскага вельмі добра адпавядае цяперашняму стану нашага сучаснага грамадства. Мы настойліва шукаем у мінулым рэцэпты выратавання ад сваіх цяперашніх няшчасцяў, але, на жаль, толькі пацвярджаем афарызм Гегеля: «Гісторыя вучыць толькі таму, што нічому не вучыць». Наша грамадства стамілася ад ілжэпрарокаў і радыкальных, адзіна правільных рашэнняў і тэорый, і таму, як мне здаецца, усё большую цікавасць выклікаюць гістарычныя асобы, у аснове светапогляду якіх ляжыць здаровы розум, цярпімасць і пачуццё меры. Да такіх асоб мы з поўным правам можам аднесці і Васіля Осіпавіча Ключэўскага, які быў сапраўдным рыцарам гістарычнай навукі.

Мяне заўсёды захапляла наяўнасць у В. О. Ключэўскага, як і ў іншых рускіх вучоных той эпохі, высокага і тонкага пачуцця арыстакратызма. Не, не фанабэрыстага барскага арыстакратызма ўласнікаў-самадураў, а арыстакратызма духу і думкі ў бярдзяеўскім сэнсе і разуменні гэтага слова. Гэты арыстакратызм заклікаў быць цярпімым да іншага меркавання, але нецярпімым да хлусні і подласці. У той жа час гэты арыстакратызм цудоўна ўжываўся з сапраўдным, а не паказным, дэмакратызмам, які выражаўся не ў панібрацтве са студэнтамі і слухачамі, а ў поглядах і асабістых учынках. Як вядома, Ключэўскі без ваганняў заступіўся за свайго вучня П. Н. Мілюкова, калі той быў арыштаваны за антыўрадавую дзейнасць. Аўтарытэт вучонага быў на столькі вялікім, што ўрад адпусціў Мілюкова за мяжу. Мне здаецца, што для нас, маладых гісторыкаў, асабліва важным з'яўляецца характэрнае Ключэўскаму разуменне гісторыі, яго адносіны да гістарычнага працэсу. Метадалогія і філасофія гісторыі Ключэўскага заўсёды была аб'ектам для крытыкі. Сапраўды, аматар стройных філасофскіх збудаванняў знойдзе ў Ключэўскага шмат уразлівых месц. Адныя абвінавачваюць Ключэўскага ў ідэалагізме і эклектызме, іншыя ў празмерным матэрыялізме і пакланенні сацыялогіі. Адзін з буйнейшых савецкіх даследчыкаў творчасці Ключэўскага акадэмік М. В. Нечкіна піша: «Мабыць самай драматычнай рысай эклектычнай метадалогіі Ключэўскага з'яўляецца тое, што яна аказалася практычна непатрэбнай яму самому. Метадалагічная канцэпцыя аказалася лішняй у яго асабістай творчасці, не паслужыла яму ў практыцы даследчай работы». У той жа час філосаф Фядотаў б 'е Ключэўскага з другога боку: «Ключэўскі адчуваў неабходнасць апраўдваць сваю гістарычную работу перад судом сацыялогіі... Гісторык у Ключэўскім быў тэрарызаваны сацыялогіяй, і рабіў выгляд, што прымае яе сацыялагічны заказ».

Мне здаецца, што гэта крытыка недастаткова абаснавана. Мабыць, гэта шчасце для нас, гісторыкаў, што Ключэўскі не будаваў ніякіх адцягнутых філасофскіх схем і не падпарадкоўваў ім сваё разуменне гістарычнага працэсу. Мы ведаем, што закрытыя філасофскія сістэмы непазбежна вядуць да дагматызму. Але гэта не адпавядала складу мыслення і светапогляду вучонага, які ўспрымаў жыццё людзей і гісторыю грамадства такой, якая яна ёсць ва ўсёй яе разнастайнасці і супярэчлівасці. Таму мне здаецца неабаснаваным сцвярджэнне Нечкінай, што буржуазная абмежаванасць перашкодзіла Ключэўскаму прызнаць класавую барацьбу галоўнай рухаючай сілай гісторыі, а эканамічны фактар — пануючым у жыцці грамадства. Тут мае рацыю, як мне здаецца, буйнейшы даследчык тэарэтычных поглядаў Ключэўскага Тхаржэўскі, калі адводзіць пытанне аб прымаце эканомікі або палітыкі, дзяржавы або народа, ідэі або матэрыялістычных умоў, як не маючае адносін да справы. Ключэўскі сцвярджаў, што разглядаў сваю гісторыю рускага грамадства як уклад у падрыхтоўку навукі аб грамадстве. Вельмі добра сказаў аб метадалогіі Ключэўскага амерыканскі даследчык Т. Эманс: «Тое, чаму вучыў Ключэўскі, не было метадам з маленькай літары — гэта было агульным дасягненнем навукі, якому можна было павучыцца ў іншых, не было гэта і тэорыяй з вялікай буквы — метафізікай. Гэта было наглядным паказам, часткова ў манаграфіях і большай часткай ў яго курсе, тэматыкі, значнай колькасці з 'яў — эканамічных, сацыяльных, палітычных, геаграфічных, якія маглі б паслужыць для пабудовы рацыянальнага тлумачэння гісторыі, адным словам, той самы «эклектызм», які Нечкіна назвала яго трагедыяй». Галоўнымі састаўляючымі школы Ключэўскага Эманс назваў эклектызм і незвычайную настойлівасць у выкарыстанні архіўных матэрыялаў. Адметнымі рысамі яго школы можна назваць вельмі крытычныя адносіны да бюракратычна абсалютысцкай дзяржавы і вялікую ўвагу да даследавання дэцэнтралізацыі і самакіравання ў рускай гісторыі. Ключэўскі пісаў, што больш за ўсё ён хацеў, каб чытачы вынеслі з яго прац яснае ўяўленне аб двух узаемазвязаных працэсах, развіцці дзяржаўнасці і развіцці народнасці. Гістарычныя факты з 'яўляліся для Ключэўскага тым жа, што і дровы для агню, яны служылі цаглінкамі для пабудовы незвычайна жывой і прыгожай формы выкладання гістарычнага матэрыялу. Разам з тым, вучоны ніколі не падганяў факты пад загадзя прыдуманыя схемы і тэорыі. Грузінскі філосаф Мераб Мамардашвілі пісаў: «Подзвіг не ў тым, каб змяніць свет, а ў тым каб зразумець яго». Прыкладна так разумеў сваё прызначэнне і В. О. Ключэўскі: «Прызначэнне інтэлігенцыі — разумець рэчаіснасць, становішча сваё і свайго народа». І гэтаму ён заставаўся верным усё сваё жыццё.

**С. ТОКЦЬ,**
**студэнт 4 курса гістфака.**

**ДАСЛЕДАВАННЕ**

## ШЛЯХ ДА ЦУДОЎНАГА ХРАМА ВЕДАЎ

Словы з фільма «Пакаянне»: «Для чаго патрэбна вуліца, калі яна не вядзе да Храма»— сталі ў цяперашні час прыказкай. Гістарычныя працы В. О. Ключэўскага, яго гісторыя вядуць нас да цудоўнага Храма ведаў. Ключэўскі не проста гісторык, але і буйны пісьменнік, а галоўнае — ён быў вельмі рускім чалавекам, глыбокім мысліцелем, да гісторыі адносіўся як да навукі, усё сваё жыццё імкнуўся спасцігнуць заканамернасці гістарычнага развіцця, знайсці сэнс вывучаемых ім падзей.

Курс рускай гісторыі Ключэўскага даўно ўжо лічыцца бібліяграфічнай рэдкасцю. З канца 50-х гадоў да цяперашняга часу многія пакаленні моладзі раслі па-за гісторыяй Ключэўскага, тры дзесяцігоддзі яна не перавыдавалася. У культуры, а тым больш у гісторыі не можа быць нічыёй зямлі. Усялякая пустата, любая канфіскацыя культурных і духоўных каштоўнасцей вельмі хутка запаўняецца духоўнай пустатой. Сёння мы гэта добра бачым, адчуваем на сабе, ведаем, што такое духоўны вакуум. Як змагацца з бяздушнасцю або чэрствасцю душ, рэчыўнасцю, забываючы або абмяжоўваючы нас ад тых духоўных вышынь, якія былі дасягнутыя нашымі продкамі? І тут працы Ключэўскага даюць вельмі шмат для роздуму.

Руская гістарычная думка ніколі не несла ў сабе ідэй нацыянальнай перавагі. Вельмі добра сказаў аб гэтым Ключэўскі: «Нацыянальная гордасць — культурны стымул, без якога можа абыйсціся чалавечая культура. Нацыянальная ганарлівасць, як і нацыянальнае самазневажанне,— гэта толькі сурагаты народнай самасвядомасці. Трэба дабівацца сапраўднага дабра, праўдзівай самасвядомасці без удзелу вельмі няпэўных намераў».

Ключэўскі валодаў нейкай дзіўнай духоўнай і маральнай сілай. Крытыкуючы характар велікаруса, яго нельга папракнуць у адсутнасці патрыятызму. Ён гаворыць: «Народныя прыкметы велікаруса наравістыя, як і прырода Велікарусі. Яна вельмі часта смяецца над самымі асцярожнымі разлікамі велікаруса; наравістасць клімату і глебы падманвае самыя сціплыя яго надзеі, і, звыкнуўшыся з гэтым падманам, разважлівы велікарус любіць часам выбраць самае безнадзейнае рашэнне, супрацьпастаўляючы нораву прыроды нораў асабістай адвагі. Гэта схільнасць дражніць шчасце, гуляць у поспех і ёсць велікарускі «авось». Жыццёвыя няроўнасці і выпадковасці прывучылі яго больш абмяркоўваць пройдзены шлях, чым узважваць далейшы, больш аглядвацца назад, чым заглядваць наперад. Гэта ўменне і з'яўляецца тым, што мы называем заднім розумам». Мне здаецца, што лепш быць моцным «заднім розумам», чым зусім не аглядвацца назад.

Васіль Осіпавіч вельмі добра заўважыў: «Чалавек упрыгожвае тое, у чым жыве яго сэрца». А што здолеем упрыгожыць мы?

**Г. ПРЫХОДЗЬКА,**
**студэнтка 4 курса гістфака.**

## В. О. КЛЮЧЭЎСКІ ПРА ШКОЛУ

**«Па школе заўсёды можна даведацца, ці валодае грамадства ўсталяваўшымiся поглядамі на задачы адукацыі. Часта даводзіцца чуць, што быццам школа павінна вучыць таму, што спатрэбіцца ў жыцці. Там, дзе пануе такое меркаванне, погляд на мэты адукацыі яшчэ не ўсталяваўся, таму што такое меркаванне падпарадкоўвае школу густам, якія пануюць у дануюю хвіліну, робіць вучня прыслугай або ахвярай часовых патрэб дарослага грамадства, з моладзі рыхтуецца ў школе жывая дрэсіраваная сіла, прызначаная для вядомай тэхналагічнай вытворчасці, якую патрабуе грамадства, ці арганізаваны інструмент, які замяняе механічную сілу. Такое меркаванне пазбаўляе школу ўсялякай устойлівасці, робіць яе цацкай выпадковых пошасцяў. Калі грамадствам кіруюць дзелавыя людзі, яны здольныя надаваць школе практычныя напрамкі, разлічаныя на бліжэйшыя перыяды часу; але стануць кіраўнікамі грамадства вясёлыя галовы, якія абвесцяць, што жыць — значыць «вкушать» радасці жыцця, і школа пераўтворыцца ў танцавальны ці музычны клас. Сапраўды, прасцей было б устанавіць зваротную сувязь школы да жыцця — такую, каб не школа вучыла таму, што спатрэбіцца ў жыцці, а жыццё патрабавала таго, чаму вучыць школа. І само пытанне аб адносінах школы да жыцця ліквідавалася б, школа заняла б цвёрдае і належнае ёй становішча, стала б не прыслужніцай, а выхавальніцай і кіраўніцай жыццёвых густаў і патрэб. Але гэтыя простыя адносіны ўстанавіць заўсёды цяжэй: школьны ўзрост дрэнна ведае патрэбы дарослых, а дарослыя не любяць рэпеціраваць у жыцці школьныя ўрокі. Наогул, людзі шмат думалі аб тым, як прыстасаваць школу да жыцця, і вельмі мала задумваліся над тым, як бы ўладкаваць сваё жыццё так, каб да яго змагла прыстасавацца школа».**

**ЗАХОДНІ ЎПЛЫЎ У РАСІІ ПАСЛЯ ПЯТРА. (1890— 1891 г.г.).**

# ГАСПАДЫНЬКА

Чакаем гасцей

## СВЯТОЧНЫ СТОЛ

Прыгожа накрыты стол заўсёды выклікае апетыт і задавальненне ва ўсіх, хто сядзіць за ім. Колькасць чалавек за сталом павінна адпавядаць памеру стала (не менш 60 см на чалавека).

Белы абрус — абавязковая прыналежнасць святочнага стала. Яна павінна быць старанна папрасаванай, без маршчын, з акуратна падрубленымі бакамі. Часам замест абруса можна выкарыстаць невялікія прыгожыя сурвэткі з тканіны або саломкі, рознакаляровыя ці аднатонныя. На іх ставяць прыборы і талеркі з закускамі.

Вялікія талеркі ставяць па краю стала, а маленькія павінны быць аддалены ад яго на 2 см. Талерачкі для салата і кубкі для кампота ставяць з правага боку ад асноўнай талеркі, бліжэй да сярэдзіны,



іх ставяць злева, калі стол сервіруецца бакаламі. На стале, накрытым для чаю ці кавы, талерка для піrожных ставіцца бліжэй да краю, насупраць кожнага чалавека, а кубак — некалькі ў правы бок і бліжэй да сярэдзіны стала. Кафейнік ці чайнік, незалежна ад памеру, ставіцца каля гаспадыні, лепш, калі ёсць магчымасць паставіць яго збоку на маленькі столік.

Нож заўсёды кладуць справа ад талеркі, лязом унутр, відэлец — злева, зубамі ўверх. Відэлец можа быць справа ў тым выпадку, калі страву трэба есці без нажа. Вялікая лыжка павінна ляжаць справа, побач з нажом, а маленькая, дэсертная,— перад талеркай ручкай направа. Замест спецыяльнага рыбнага прыбора можна выкарыстаць два відэльцы. Фруктовы нож, калі няма лыжкі для дэсерта, кладуць на яе месца або на талерку для фруктаў. Калі ў меню прадугледжана вялікая колькасць страў, то прыборы кладуць у той паслядоўнасці, як прадугледжана падача страў. Кафейная або чайная лыжка павінна ляжаць на правым баку сподка, дэсертны відэлец — справа ад дэсертнай талеркі.

Кілішак і бакал ставяць перад нажом. Калі прадугледжана падача некалькіх сартоў він (чырвонае віно, белае, шампанскае), тады справа трэба паставіць бакал для таго віна, якое будзе прапанавана першым, а астатнія размясціць злева ад яго. Больш трох бакалаў ставіць на стол нельга. Для піва і ліманаду патрэбны шклянкі.

На святочным стале трэба пакласці ці паставіць на талерку прыгожыя сурвэткі. Кавалачак хлеба пры адсутнасці спецыяльнай піражковай талеркі можна пакласці на сурвэтку.

Самае найлепшае ўпрыгожванне стала — кветкі. Яны павінны быць нізка падрэзанымі, каб букет нікому не перашкаджаў. Кветкі з рэзкім пахам, якія хутка вянуць і асыпаюцца, не падыходзяць для ўпрыгожвання стала. У навагодні вечар кветкі або яловую галінку можна пакласці перад кожным прыборам. На дзіцячым святе кветкі можна замяніць прыгожымі вазачкамі з палачкамі, на якія нанізаны цукеркі.

Сядаць за стол можна толькі пасля запрашэння гаспадыні. Сурвэткі распраўляюць і кладуць на калені, але ні ў якім разе не за каўнер кашулі. Пачынаць есці трэба тады, калі ўсе госці селі за стол. Гаворка заўсёды вядзецца ў стрыманай форме. Пры размове нельга размахваць рукамі, тым больш, калі вы трымаеце ў руках прадметы сталовага прыбора. Накладваючы сабе страву, трэба браць кавалачак, які ляжыць бліжэй да вас, спецыяльным відэльцам ці лыжкай, але не сваімі прыборамі. Падносіць страву трэба з левага боку, а выкарыстаны посуд прыбіраць з правага. Калі разліваюць алкагольныя напіткі, кілішкі і бакалы павінны стаяць на сваім месцы. Падымаць прынята толькі піўныя кубкі і фужэры для шампанскага. Пры разліве чаю або кавы, вы можаце прыпадняць кубак разам са сподкам і працягнуць іх гаспадыні. Хлеб трэба ламаць маленькімі кавалачкамі, але ні ў якім разе не рэзаць нажом. Нельга дуць на гарачыя стравы. У лыжку трэба браць столькі, колькі можна адразу праглынуць. Лыжку трэба падносіць да рота, а не схіляцца да яе. Страву, якую вы ясце пры дапамозе нажа і відэльца, не трэба адразу ўсю разрэзваць на маленькія кавалачкі. Накладваць на відэлец гарніры трэба нажом. Пташынае мяса ядуць з дапамогай нажа і відэльца, і толькі ў сябе дома мяса можна трымаць за костачку, лепш выкарыстаць пры гэтым сурвэтку з паперы.

Тарты і мяккія піrожныя ядуць дэсертным відэльцам або маленькай лыжкай. Бакалы з віном трэба трымаць толькі за ножку. Тосты павінны быць кароткімі.



## СВЕЖЫЯ РЭЦЭПТЫ З ЧЭРСТВАГА ХЛЕБА

**Закуска.** Вымачыце ў малацэ вялікага селядца, 200 г пшанічнага хлеба і прапусціце ўсё праз мясарубку. У атрыманую масу пакладзіце 50 г маянэза. Усё добра ўзбіце і ўпрыгожце пятрушкай.

**Хлебны суп.** Падсмажце на сметанковым масле 300 г сухіх жытніх скарынак, 60 г нарэзанай цыбулі і пятрушку. Заліце ўсё вадой (1,5 літра), пасаліце і давядзіце да кіпення. Добра ўзбіце тры яйкі і, бесперапынна памешваючы, дабаўце іх у кіпячы суп. Пасыпце суп зяленівам.

**Другая страва.** Абрэзаўшы скарынкі, нарэжце хлеб тонкімі лустачкамі, пакладзіце іх на скавараду з разагрэтым сметанковым маслам. На кожную лусту выліце па яйцу, пасаліце і



смажце да гатоўнасці. Зверху ўпрыгожце зяленівам.

ГАТУЕМ СМАЧНА

## *Капейка рубель беражэ*

Часам здараецца, ад снедання ці абеду застанецца, скажам, 300—400 грамаў макаронаў ці кашы. Хіба сённяшнім днём дапушчальна іх выкідваць? Лепш паставіць у халадзільнік, а на наступны дзень прыгатаваць з цёртым сырам. Ці заліць яйкамі, спачатку ўзбітымі з цукрам, і запекчы ў духоўцы.

Дадаўшы да вязкай кашы яйкі, можна прыгатаваць катлеты ці біточкі.

Смажаную рыбу, што засталася ад абеду, можна падаць на снеданне пад марынадам, ці запекчы на грэнках з гароднінай і соусам. Смачны атрымаецца з яе і фарш — для піражкоў ці блінчыкаў.

Рысавы адвар не спяшайцеся выліваць як непатрэбны. Ён асабліва карысны для тых, хто пакутуе на страўнікавыя захворванні. Для смаку яго можна падсаладзіць малінавым ці клубнічным варэннем.

Адвар бурака можна выкарыстоўваць у запраўку для вінегрэту, для афарбоўкі баршчу, можна закісліць і спажываць затым у якасці бураковага квасу ў боршч.

У час варкі макаронных вырабаў у адвар пераходзіць у сярэднім каля 8,5 працэнтаў сухіх рэчываў. Таму яго мэтазгодна выкарыстоўваць для прыгатавання заправачных пюрэпадобных супоў.

Не выкідвайце яблычныя лупіны! Лепш наліце ў каструлю 2—2,5 шклянкі вады, апусціце ў яе лупіны і закіпяціце, дадаўшы цукар па густу. Атрыманы адвар — выдатны сродак супраць кашлю.

Часта для прыгатавання кандытарскіх вырабаў выкарыстоўваюць толькі бялкі яек. З жаўткоў можна зрабіць маянэз. Гэта зусім не складана. Вазьміце сталовую лыжку парашку гарчыцы, 10 грамаў цукровага пяску, столькі ж солі і разатрыце. У другой пасудзіне падагрэйце (толькі не на адкрытым агні) адзін яечны жаўток і чвэрць лыжкі алею і паступова, у 5—6 прыёмаў, улівайце сумесь у гарчыцу. Расцірайце, каб на паверхні не было бліскавак. Маса павінна быць светлай, густой. Для вастрыні можна дадаць крышку воцату.

Макароны. Вараныя макароны дабавіць у булён, пакласці туды свежае зяленіва. Макароны перамяшаць з гароднінай, пакласці ўсё гэта ў змазаную тлушчам форму, паліць сумессю малака з яйцом, пасыпаць тоўчанымі сухарамі, дабавіць маргарын і запекчы ў гарачай духоўцы.

Бульба. Дробна нарэзаную бульбу дабавіць у булён, пакласці туды свежае зяленіва.

Нарэзаную кубікамі бульбу разагрэць у любым соусе і добра патушыць. Пры жаданні можна таксама дабавіць каўбасу ці нарэзанае кубікамі свіное сала і моркву.

Нарэзаную бульбу перамяшаць з нарэзанай гароднінай, мукой, яйцом, вострымі прыправамі, дабавіць мяса, рыбу ці каўбасу. Прыгатаваць клёцкі, укачаць іх у муку і абжарыць на тлушчы.

Бульбянае пюрэ абжарыць, дабавіць яйцо, цёртыя сухары і нарэзанае зяленіва, перамяшаць. Атрыманую масу раскачаць слоем у 1 см і нарэзаць аднолькавымі кускамі. Абжарыць на тлушчы.

Гародніна. Пакласці ў соус, дабавіць нарэзаную кубікамі вяндліну ці каўбасу. Падаць з бульбай, рысам ці макаронамі.

## СКАРБОНКА КАРЫСНЫХ ПАРАД

**Зусім няцяжка, «круцячыся» на кухні, выканаць гэтыя простыя, але карысныя парады.**

* * *

**На бляхах часта ўтвараюцца карычневыя плямы. Патрыце іх макраватай сталовай соллю, і яны лёгка змыюцца.**

* * *

**Малако не прыгарыць пры кіпячэнні, калі каструлю спаласнуць халоднай вадой і пакласці на дно перавернуты спадачак.**

* * *

**У падгарэўшага малака прападзе непрыемны смак, калі каструлю з малаком паставіць у пасудзіну з халоднай вадой, а ў малако насыпаць трошкі солі.**

* * *

**Калі малако пабегла, накрыйце залітую ім паверхню пліты мокрай газетай. Гэта перашкодзіць паху распаўсюдзіцца па ўсяму памяшканню.**

* * *

**Для таго, каб металічныя прадметы блішчалі, натрыце іх сухой змятай газетай.**

* * *

**Замарожаную рыбу пакладзіце ў поліэтыленавую торбачку, моцна перавяжыце ніткай і апусціце ў цёплую ваду — рыба размарозіцца хутчэй.**

* * *

**Рыбу лягчэй пачысціць, папярэдне нацёршы яе соллю, яна не выслізне з рук.**

* * *

**Вы хочаце хутка зварыць курыны булён. Паварыце курыцу хвілін дваццаць, дастаньце і апусціце на некалькі хвілін у халодную ваду. Затым працягвайце варку ў кіпячым булёне.**

* * *

**Таматны соус у адкрытым слоіку не заплесніць, калі яго пасыпаць соллю і наліць зверху трошкі алею.**

* * *

**Калі саліць! Булён — за паўгадзіны да гатоўнасці, печанае кавалачкамі мяса — калі ўжо гатовае, вялікім куском — да пачатку прыгатавання.**


Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-7?-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 1217
т. 2000

В. а. рэдактара
Г. М. Каменева